# Музычная міні-праграма «Для мілых мам» ў аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў

8 Сакавіка — самае цудоўнае, самае пяшчотнае свята вясны! Гэта дзень усмешак і добрага настрою. Для мам, сястрычак, бабуль і запрошаных гасцей адбылася пастаноўка спектакля «Папялушка» выхаванцамі аддзялення і музычная міні-праграма «Для мілых мам». Праграма атрымалася добрая, пазітыўная і святочная. Прысутныя з захапленнем, цікавасцю і гучнымі апладысментамі сустракалі «артыстаў». У завяршэнні свята маладыя людзі паднеслі прыгожыя кветкавыя кампазіцыі, якія зрабілі сваімі рукамі. Святочны дзень праляцеў на адным дыханні вясны, усяляючы ў душы выхаванцаў мелодыю любові і натхнення да прыгожага!















